# Ода Нацыяналцы

## Дзень беларускага пісьменства ў Добрушы, векавы юбілей Нацыянальнай бібліятэкі і Дзень народнага адзінства: верасень прымусіў задумацца пра вечныя каштоўнасці

У будынку на рагу Чырвонаармейскай і Кірава, дзе цяпер Савет Рэспублікі, з 1962 года доўгі час размяшчалася Дзяржаўная бібліятэка БССР. Яна насіла імя правадыра сусветнай рэвалюцыі і праз тое, што была ўлюбёным месцам студэнцкай і навуковай моладзі, заканамерна набыла іншую, нефармальную і амаль ласкавую назву – Ленінка. Прабавіць тут цэлы дзень з ранку да позняга вечара ў кампаніі з кніжкамі лічылася звыклай справай, асабліва для тых, хто жыў у інтэрнаце, дзе спакойна пачытаць ці нешта напісаць было праблематычна.

Надзвычайны наплыў наведвальнікаў у Ленінку здараўся падчас студэнцкіх сесій. Памяць надзіва ярка малюе карцінку сярэдзіны 1980-х: у вялізнай агульнай зале да месца, дзе замаўляюць і выдаюць кнігі, чарга, а за масіўнымі шырокімі сталамі – незлічоная колькасць схіленых галоў. Знайсці вольнае месца – амаль невырашальная праблема, але спосаб прыдумалі. Пасылалі ганца – па чарзе, каб ніхто не крыўдзіўся. Пакуль астатнія бачылі салодкія ранішнія сны, хтосьці адзін выпраўляўся ў Ленінку і займаў стол для аднагрупнікаў. Зрэшты, была яшчэ адна нагода не спяшацца. Апоўдні адчынялася «цэкоўка» – сталовая, што месцілася побач з Ленінкай, у тагачаснай гасцініцы «Октябрьская» (цяпер тут Прэзідэнт-гатэль). У адной зале абедала «наменклатура» – супрацоўнікі з суседніх будынкаў ЦК КПБ і ЦК камсамола. Неяк з аднакурсніцай з цікавасці абсалютна вольна туды зайшлі і ніякіх праяў чагосьці наменклатурнага не заўважылі: спакойна паелі, падзякавалі за ветлівае абслугоўванне і адправіліся па сваіх справах. Другая зала лічылася даступнай для ўсіх ахвотных. Для вечна галодных, нераспешчаных студэнтаў гэта была раскоша: уражлівы выбар страў, танна, усё свежае і надзвычай смачнае! Да таго ж як пан сядзіш за сталом з абрусам, і афіцыянтка на цялежцы падвозіць упадабаныя стравы. Ніякія згрызоты сумлення, што амаль паўдня прайшло і даўно трэба быць у бібліятэцы, не дзейнічалі, безальтэрнатыўна перамагала жаданне прыгожа і смачна паесці. У «цэкоўцы» часам выпадала сустрэць папулярных на той час паэтаў і музыкантаў і, калі пашанцуе, нават пасядзець з імі за адным сталом. І гэта таксама нас, будучых журналістаў, неяк натхняла.

У Ленінцы ўсё было працай. Ачмурэлыя ад бясконцага чытання і пісання наведвальнікі здымалі стрэс у невялікім буфеце. Тут можна было з'есці, калі паспееш, дэфіцытныя сасіскі, выпіць кубачак распушчальнай кавы ці шклянку гарбаты з булачкай альбо, калі з грашыма бедна, мінералкі «Мінская-4». Яшчэ замораныя навукай маладзёны бязбожна палілі. У прыбіральні, прынамсі, мужчынскай цыгарэтны дым заўсёды стаяў хоць сякеру вешай, і ніякія заўвагі і ўшчуванні на курцоў, паглыбленых у свае роздумы, не дзейнічалі.

Нават па бытавых дробязях можна было зразумець: галоўнай бібліятэцы краіны цесна і нязручна, некамфортна. Што казаць пра іншыя, значна больш істотныя праблемы з захаваннем фондаў, якія штогод узрасталі, урэшце, з якасцю абслугоўвання наведвальнікаў. Прыязнасць і прафесіяналізм

бібліятэчных работнікаў, гэтых мілых дзяўчат і жанчын, не заўсёды дапамагалі своечасова знайсці ці атрымаць у чытальнай зале патрэбнае выданне. Часам яны, стомленыя нараканнямі карыстальнікаў, маглі сказаць, што ім таксама няпроста і патрэбны ўжо новы, сучасны будынак, дзе будуць створаны неабходныя ўмовы і для кніг, і для людзей.

У 1992 годзе Ленінку перайменавалі ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі, і яна працягвала працаваць у старых сценах. З новым статусам даўнія праблемы падаваліся яшчэ больш актуальнымі, але ў 1990-я праз дэфіцыт сродкаў да ўзвядзення новага будынка рукі не даходзілі. Дакладна вядома адно: новы кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка заўсёды пра гэта памятаў і, як толькі з'явілася магчымасць пабудаваць не проста функцыянальнае памяшканне для Нацыяналкі, а знакавы для Беларусі архітэктурны аб'ект, падпісаў адпаведны ўказ.

Узвялі за вельмі сціслы для такога збудавання тэрмін – тры з паловай гады – па задумцы архітэктараў Міхаіла Вінаградава і Віктара Крамарэнкі, чый праект перамог яшчэ ва ўсесаюзным конкурсе. Так патрабаваў Прэзідэнт – не зацягваць будоўлю. У чэрвені 2006-га «беларускі дыямент» здалі ў эксплуатацыю з гарантыяй ажно на пяцьсот гадоў. Не толькі знешне, а і паводле функцыянальных характарыстык ён быў шмат у чым наватарскім: фондасховішча над зямлёй, тэхналогіі спайдарнага шклення, сістэма тэлеліфтаў, якая дастаўляе са сховішча патрэбныя чытачам кнігі за 10–15 хвілін на 25 станцый, і шмат іншых прыемных «дробязей». Сам жа будынак неўзабаве ўвайшоў у энцыклапедыі і сусветныя даведнікі па архітэктуры, архітэктурных і мастацкіх асаблівасцях.

Будавалі Нацыяналку ўсёй краінай – бесперапынна, у любое надвор'е. Праца ішла ў тры змены, у асобныя перыяды адначасова на будаўнічай пляцоўцы шчыравалі да трох тысяч рабочых і спецыялістаў. За станам спраў пільна сачыў Прэзідэнт, пры неабходнасці «падштурхоўваў» фінансаванне дый, чаго граха таіць, некаторых падрадчыкаў. Звычайныя людзі самі, без прынукі дасылалі грошы на будаўніцтва, удзельнічалі ў суботніках. Цяпер, магчыма, некаторым цяжка зразумець прычыны народнага энтузіязму і яднання. Гонар! Разумеецца, гонар – за сваю краіну і за народ, які не мерае ўласнае жыццё выключна чаркай-шкваркай, а дбае пра духоўнае і інтэлектуальнае развіццё, першакрыніцай якога смела можна лічыць кнігу. Гэта патрыятычнае адчуванне добра ведаю, бо і сам



крышачку далучыўся да вялікай справы, памахаўшы колькі гадзін венікам на паверхах і пацягаўшы насілкі са смеццем на суботніку ў амаль гатовым будынку Нацыяналкі. Сёння нам, можа, не хапае якраз такога маштабнага праекта, каб усёй краінай, разам узяцца за яго і зноў адчуць сябе адзінай вялікай сям'ёй.

У фондах галоўнай бібліятэкі краіны больш як 9 млн экзэмпляраў, і праца па збіранні каштоўнага кніжнага скарбу працягваецца. Шмат робіцца для папулярызацыі кнігі, праводзіцца мноства выстаў і творчых сустрэч. Яшчэ адна вялікая місія Нацыяналкі – вяртанне духоўных набыткаў нашага народа. Старажытныя кнігі і рукапісы, выданні з аўтографамі знакамітых дзеячаў – бясцэннае багацце, што захоўваецца тут.

Дзякуй, Нацыяналка, за веды і светлыя імгненні студэнцкага юнацтва, за жыццёвыя ўрокі і непераадольнае жаданне насалоджвацца бязмежным светам Кнігі!

## «Душу адвяла»

– Божанька паглядзеў, куды і чаго людзі едуць, дык даў добрае надвор'е, – неяк надта адмыслова паздароўкаўся са мной зухаваты дзядзька на цэнтральнай вуліцы Добруша, куды ў першыя вераснёўскія выхадныя з'ехаліся на Дзень беларускага пісьменства госці з усяе краіны.

Гэта адно з першых свят суверэннай Беларусі, што адзначаецца на дзяржаўным узроўні. За многія гады яно стала звыклай старонкай нацыянальнага календара, і цяпер цяжка ўявіць пачатак восені без атмасферы адухоўленасці і натхнення, якую стварае Дзень беларускага пісьменства. Ён зноў вяртае нас да вытокаў і разумення, хто мы і адкуль, вучыць шанаваць продкаў і гісторыю сваёй краіны, любіць роднае слова. І робіць гэта далікатна і ненавязліва, удала спалучаючы катэгорыі высокага сэнсу з непазбежнай святочнай весялосцю і забавамі.

Вось і Добруш, аблашчаны сонечнымі вераснёўскімі промнямі, пасвяжэлы, радасны і шчаслівы, два дні літаральна патанаў у непараўнальнай ні з чым святочнай атмасферы Дня беларускага пісьменства. Няма сэнсу пераказваць усё тое, што там адбывалася: хто сачыў за падзеямі ў СМІ і сацсетках, ведае. Але пабываць у Добрушы ў гэтыя дні варта было. І, відаць, не толькі я так меркаваў – у брэндзіраваныя адмыслова да свята электрычкі Гомель – Добруш было не ўбіцца што сюды, што ў зваротным напрамку.



**Гістарычны момант на пляцоўцы БЕЛТА. Старшыня Нацыянальнага аргкамітэта Дня беларускага пісьменства, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Ігар Петрышэнка ставіць пячатку «Добруш-2022» пад зваротам да ўдзельнікаў свята праз 10 год, у 2032-м. Да патрэбнага моманту дакумент з подпісамі ганаровых гасцей будзе захоўвацца ў раённым краязнаўчым музеі**

На бульвары прэсы заўважна вылучаўся прэзентацыйны модуль БЕЛТА. Прадстаўнічая творчая каманда прывезла ў Добруш не толькі кнігі, часопісы «Беларуская думка» і «Экономика Беларуси», газету «7 дней», якія выдае інфармацыйнае агенцтва. На набярэжнай Іпуці працавала фотавыстава «Судьбы, сложенные в треугольник». На белтаўскай пляцоўцы са сваімі прыхільнікамі сустрэліся заслужаная артыстка Беларусі Алёна Ланская і пісьменнік Віктар Шніп. А ўдзельнікі рыцарскага клуба з Рэчыцы вучылі гасцей свята страляць са старажытнай зброі, той, якой карысталіся нашы продкі. Словам, творчы ўнёсак БЕЛТА важка

і арганічна ўліўся ў агульную атмасферу свята, што адзначылі шматлікія наведвальнікі нашага прэзентацыйнага модуля і члены арганізацыйнага камітэта Дня беларускага пісьменства.

У чым усё ж такі прыцягальная сіла гэтага свята, чаму яно так цікавіць і захапляе людзей? Лепей спытаць у іх саміх, скажаце? Магчыма. І ўсё ж мяркую, прычына ў тым, што яно непарыўна звязана са шматвекавой гісторыяй нашай Беларусі і лёсамі славутых землякоў, якія жылі і змагаліся за яе незалежнасць і росквіт. У ім сканцэнтравана, мне падаецца, сутнасць пераемнасці пакаленняў, што стваралі велізарную духоўную і культурную спадчыну, якой мы ганарымся, дбайна беражом яе і развіваем.

Падчас Дня беларускага пісьменства ў Добрушы адкрылі помнік славутаму земляку, народнаму пісьменніку Беларусі Івану Шамякіну. Бронзавую скульптуру ўстанавілі ў цэнтры, на праспекце Міру. «На творах Шамякіна выраслі цэлыя пакаленні беларусаў. Яго творчасць – гэта гімн чалавеку працы, чалавеку-стваральніку», – сказаў на ўрачыстай цырымоніі старшыня Добрушскага райвыканкама Аляксандр Матарас. Варта адзначыць, што станоўчых герояў сваіх твораў, людзей высокіх ідэалаў, класік знаходзіў не толькі ў сучасным жыцці, а і ў мінулым: раманы «Зеніт» і «Слаўся, Марыя!».

Сёлета, у Год гістарычнай памяці, Дзень беларускага пісьменства набыў асаблівы сэнс. Таму надзвычай сімвалічнай падалася падзея, што адбылася ў першы дзень свята: да ўсіх ваенных мемарыялаў і помнікаў у раёне адначасова ўсклалі кветкі, ушанавалі памяць загінулых у барацьбе з ворагам і ахвяр вайны. Так, менавіта гістарычная памяць знітоўвае ў адзінае, непахіснае для нашага народа разуменне ўсё тое, што дае нам сілы жыць і ствараць дзеля роднай зямлі. Гэтая повязь часу яднае нас, адкрываючы шлях у светлую будучыню Беларусі, якую мы будуем разам.

– Вы, мабыць, з Добруша, са свята? – заўсміхалася жанчына, што сядзела побач у цягніку Гомель – Мінск.

– А вы што, экстрасэнс?

– Дык і я ж такую выйграла ў віктарыне, – яна кінула позірк на аўдыякнігу з раманам Уладзіміра Караткевіча, якую я паклаў на столік. – Харошае свята, патрэбнае! Душу адвяла…

## Замест P.S.

Другі раз сёлета Беларусь адзначыла Дзень народнага адзінства, лічы, трэцяе па значнасці дзяржаўнае свята пасля Дня Незалежнасці і Дня Перамогі. Яно прайшло заўважна, маштабна, з мностам грамадскіх акцый і ініцыятыў. Гэта найлепшае сведчанне таго, што свята паступова становіцца сапраўды народным. І, на мой погляд, стала значна менш тых, хто не разумее, што гэта за дзень у гісторыі нашай краіны. Надзвычай добра! Бо сорам не ведаць, што падзеі 17 верасня 1939 года шмат у чым вызначылі лёс нашага народа і далі важны гістарычны ўрок: трэба трымацца разам, каб перадольваць усе нягоды, складанасці і жыць, як хочам, на сваёй зямлі.

Вечныя каштоўнасці, яны таму і вечныя, што ідуць з глыбінь стагоддзяў, з нашай памяці. Сёлетні верасень даў нам шмат падстаў падумаць і паразважаць над гэтым.

*Ігар ГАНЧАРУК*